**Слухалі:** [1.] Аб зацьверджаньні статуту згуртаваньня.

**Пастанавілі:** Зацьвердзіць і даручыць кіраўніцтву падаць на зацьверджаньне у НКУС.

**[Слухалі:]** 2. Аб выбарах тымчасовага кіраўніцтва.

**[Пастанавілі:]** Зацьвердзіць кіраўніцтва ў наступным складзе: Старшыня і галоўны рэдактар К. Чорны (Раманоўскі)

Намесьнік і скарбнік К. Крапіва (Атраховіч)

Сакратар А. Бабарэка

**[Слухалі:]** 3. Аб выбарах рэвізійнай камісіі.

**[Пастанавілі:]** Зацьвердзіць рэвізійную камісію ў наступным складзе: Старшыня З. Бядуля (С. Плаўнік)

Намесьнік Я. Пушча (Плашчынскі)

Сакратар П. Глебка.

Сход праводзіў:

Запісваў: К. Чорны (М. Раманоўскі)

## № 15

ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ

Статут Беларускага літаратурнага мастацкага згуртаваньня „Узвышша“ састаўлен, згодна маіх паказаньняў, у адпаведнасьці з Пастановай ЦВК і СНК БССР ад 17/VII–1926 аб рэгістрацыі статутаў Вобшчэстваў, якія ня маюць сваёй мэтаю атрыманьне прыбыткаў і з юрыдычнага боку ніякіх хібаў памянёны статут ня мае.

ЮРЫСКОНСУЛЬТ

*2/XII–26 г.*

## № 16

### СТАТУТ
### Беларускага літаратурна–мастацкага згуртаваньня „Узвышша“

#### 1. Мэта і заданьні.

1. Беларускае літаратурна–мастацкае згуртаваньне „Узвышша“ мае на мэце разьвіцьцё беларускай пралетарскай літаратуры на падставе прынцыпаў, якія вызначаны ў рэзалюцыі ЦК ВКП(б) за 1 ліпеня 1925 г. „Аб палітыцы партыі ў галіне мастацкай літаратуры“, канкрэтна ставячы перад сабою наступныя заданьні:

а) творча–мастацкая праца;

б) крытычна–дасьледчая.